*Ганна Саўчанка*

# БАЛАДЫ-ЗАГАДКІ Ў ПЕСЕННЫМ РЭПЕРТУАРЫ ЖЫХАРОЎ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

На тэрыторыі Беларусі, у прыватнасці ў розных раёнах Гомельскай вобласці, і сёння бытуюць баладныя песні, аснову сюжэтаў якіх складаюць асабістыя адносіны. Менавіта тут яны вылучаюцца багатай варыянтнай разнастайнасцю. Даследчыца Л. Салавей вылучыла наступныя групы балад: «балады з міфалагічнымі матывамі; балады казачныя і легендарныя; балады гульнёва-карагоднага складу; балады навелістычныя; балады, якія змяшчаюць загадкі» [3, *68–69*]. Асабліва шырока бытуюць (у паўсядзённым жыцці) сярод насельніцтва Гомельшчыны варыянты баладных песень з міфалагічнымі матывамі і навелістычныя балады. Важнае месца ў песенным рэпертуары займаюць балады-загадкі, дзе блок загадак выконвае у змесце твора важную функцыю. Балады гэтага віду ў фальклоры ўсходніх славян, нягледзячы на выразную агульнасць асновы, маюць значныя адрозненні, што «выяўляюцца ў неаднолькавай паўнаце, распрацаванасці сюжэтаў, у адлюстраванні розных гістарычных рэалій, у неаднолькавасці прымеркавання ў гадавым і сямейным цыклах» [3, *140*]. Выказвалася меркаванне, што гэтая тэматычная група балад – арыгінальная разнавіднасць рытуальна-міфалагічных баладных песень. Вядома, што нельга зводзіць балады з загадкамі толькі да тэкстаў, у якіх адлюстраваны рытуалы, але нельга ігнараваць і відавочныя сувязі з імі, што прасочваецца на двух узроўнях – знешнім і ўнутраным. «Знешні ўзровень выяўляецца праз дачыненне балад да пэўных абрадаў і прамежкаў часу. <…> Унутраны ўзровень сувязі адзначаных балад з рытуалам увасабляе баладны сюжэт, яго завязка, развіццё, акалічнасці, развязка» [2, *41-42*]. Адзначым, што самі тэксты з’яўляюцца ўвасабленнем рытуалаў у песеннай форме. Агульнае змястоўнае ядро твораў, якія адносяцца да балад-загадак, скіравана на выпрабаванне розуму дзяўчыны праз веданне ёю загадак. У выніку, калі адгадка агучваецца, гераіню чакае ўзнагарода.

Паводле меркаванняў даследчыцы Л. Салавей, «беларускія балады з загадкамі маюць надзвычай шырокі спектр бытавой прымеркаванасці. Яны занатаваны як велікодныя, піліпаўскія, веснавыя, карагодныя, купальскія, пятроўскія, бытавыя, любоўныя, нават як вясельныя» [3, *140*]. Зыходзячы з разважанняў Л. Салавей, мэтазгодна суадносіць балады гэтага віду з вясновa-купальскай абраднасцю, што з’яўляецца вынікам старажытнасці іх паходжання.

Звернемся да аналізу баладных песень, што змяшчаюць загадкі, пашыраных на тэрыторыі Гомельшчыны пераважна ў вёсках Жыткавіцкага і Нараўлянскага раёнаў. Сюжэт твораў арганізаваны, на першы погляд, у выглядзе гульні паміж хлопцам і дзяўчынай, як, напрыклад, у баладнай песні, запісанай у Жыткавіцкім раёне. Калі дзяўчына адгадае загадкі хлопца, то будзе яго суджанай:

*– Ой ты, Галю, ды мая Галю,*
*Што ж я табе сказаці маю.*
*Што ж я табе сказаці маю,*
*Сем загадак загадаю.*
*Адгадаеш – маёй будзеш,*
*Не адгадаеш – чужой будзеш* [1, *642*].

Балады, якія ўтрымліваюць загадкі, кампазіцыйна пабудаваны ў форме дыялогу, дзе ў першай частцы змешчаны пытанні-загадкі з боку хлопца, а ў другой частцы гучаць адказы дзяўчыны. Далейшае вывучэнне балад-загадак Гомельшчыны дазваляе ўбачыць іх сувязь з грамадскім і духоўным жыццём народа. Напрыклад, у баладзе, запісанай ў в. Канатоп Нараўлянскага раёна, гэта пэўная колькасць загадак:

*– Ой, што расце без карэння,*
*Ой, што цвіце без насення?*
*Ой, што гарыць без полямя,*
*Ой, што бяжыць без повада?*
*Ой, што ўецца кругом дрэўца,*
*Ой, што сушыць каля сэрца?*
*Ой, што грае – голас мае?*
*– Казак дурань, што пытае.*
*Камень расце без карэння,*
*Доля цвіце без насення.*
*Сонца гарыць без полямя,*
*Вада бяжыць без повада.*
*Хмель уецца кругом дрэўца,*
*Любоў сушыць каля сэрца.*
*Скрыпка грае – голас мае* [1, *643*].

Як вядома, у міфалагічных каардынатах лік «сем» звязаны з касмалагічнай семантыкай, таму і загадкі набывалі пэўную таямнічую сілу. Гэта былі невыпадковыя пытанні да дзяўчыны: яны складалі абавязковы мінімум ведаў і «пэўную ступень прылучэння да таямніц, з'яўляліся своеасаблівым паролем людзей аднаго роду» [3, *144*]. Загадкі вар'іруюцца як па змесце, так і па колькасці. Мінімальная колькасць – тры. Так, у баладзе, запісанай у в. Бярэжцы Жыткавіцкага раёна, іх шэсць, прычым толькі тры супадаюць з загадкамі у папярэдняй баладзе:

*Ой, што расце без кораня,*
*А што ўецца круг дзерава?*
*Што пячэ без жарыцы,*
*Што жыве без дружыны?*
*Ой, што грае, голас мае,*
*Ой, што плача – слёз не мае?*
*– Камень расце без кораня,*
*Хмель уецца круг дзерава.*
*Сонца й пячэ без жарыны,*
*А казача жыве без дружыны.*

*Скрыпка грае – голас мае,*
*Салавей плача – слёз не мае* [1, *642*].

Паказальным з’яўляецца набор аб’ектаў загадвання, які ўключае прыродныя з’явы і стыхіі: сонца, зару, вецер, маланку, ваду, снег, мора, камень, траву, папараць, жывёл і птушак. Адзначым, што найперш у тэкстах баладных песень выкарыстоўваюцца назвы не выпадковых прадметаў, стыхій і з’яў, а найбольш важных, тых, якія адухаўляліся, пра якія складалі міфы і якім пакланяліся. Пытанні-загадкі ў баладных песнях маюць старажытную аснову. На працягу пэўнага гістарычнага часу загадванне мела сакральны характар, з’яўлялася магічным рытуалам. Як адзначыла Р. Кавалёва, група балад-загадак сведчыць аб тым, што «праз прыватную падзею і матыў сустрэчы ўвасабляецца падзея рытуальная, звязаная з таямніцай імені і яго вымаўлення. Вымавіць назву, імя значыла стварыць, увасобіць, адрадзіць з’яву, рэч, прадмет» [2, *43*].

**ЛІТАРАТУРА**

1. Балады ў дзвюх кнігах. Кн. 2. / Рэд. К. П. Кабашнікаў, В. І. Ялатаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 744 с.
2. *Кавалёва, Р. М.* Баладныя песні / Р. М. Кавалёва [і інш.] пад. рэд. Р. М. Кавалёвай. – Мінск: БДУ, 2010. – 100 с.
3. *Салавей, Л. М.* Беларуская народная балада / Л. М. Салавей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987. – 284 с.